355-331
Г 39

Героі
Совецкага Саюза

35.381
Г 30

СЫНЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА




# Героі Совецкага Саюза

Выданне газеты «Совецкая Беларусь»
1942 г.

## ПРАДМОВА

У баях з нямецкім фашызмам за чэсць і свабоду совецкай радзімы беларусы, як і ўсе народы СССР, праяўляюць бязмежную мужнасць і храбрасць. Сыны гордага, свабодалюбівага народа, вартыя слаўных традыцый сваіх бацькоў і братоў, якія самаадданa змагаліся за Совецкую Беларусь, за права жыць і працаваць у вольнай совецкай радзіме, дзе сонца Леніна, геній Сталіна так высока ўзнялі нашу рэспубліку да вяршынь шчасця.

У гэтыя грозныя і суровыя дні айчыннай вайны беларусы не пасрамяць свой народ. Усе яны падобна легендарнаму капітану Нікалаю Гастэла лічаць за лепшае геройскую смерць, чым жыццё ў няволі, чым здача ў фашысцкі палон.

У гэтым невялічкім зборніку мы расказваем пра групу герояў айчыннай вайны — беларусаў, якія ўдастоены вышэйшай усенароднай славы — звання Героя Совецкага Саюза.

Хай прыклад мужных напоўніць сэрцы нашы святой нянавісцю да акупантаў і вядзе ўсіх нас у бой на канчатковы іх разгром і знішчэнне ў 1942 годзе.

Публичная Библиотека СССР.
им. В. И. ЛЕНИНА
АБОНЕМЕНТ.
ПА7034

1944

# КАПІТАН
# НІКАЛАЙ ГАСТЭЛА



Незадоўга да Айчыннай вайны Нікалаю Гастэла прышлося ляцець над беларускай зямлёй. Ён убачыў бярозавыя гаі, бліскучыя вазёры, зялёныя ўзбярэжжы рэк, убачыў стагі сена. І ў полі, і ў лесе працавалі людзі, і Нікалаю здавалася, што і гэтыя касцы ў белых кашулях, і гэтыя зялёныя гаі гукаюць яму, клічуць яго да сябе. «Вось гэтак-жа, на гэтых-жа мясцінах,—думаў Нікалай,— аралі, касілі, стагавалі сена і мае дзяды, прадзеды»... І ўсім сэрцам Нікалай адчуў замілаванне да беларускай прыроды, да роднай зямлі.

Глыбока быў узрушаны Нікалай Гастэла, калі даведаўся, што нямецкія акупанты ўвар-

валіся на совецкую зямлю. Любоў да бацькаўшчыны і нянавісць да ворага ўзнялі яго ў арліны палёт. Любоў і нянавісць далі яму мужнасць і адвагу. Смелы сталінскі сокал, капітан Нікалай Францавіч Гастэла ўзняў і павёў усю сваю эскадрылью лёгкіх бамбардыроўшчыкаў. Павёў на захад, павёў туды, дзе чорныя цені сцярвятнікаў плавалі над зялёным прасторам, дзе гарэлі гарады і сёлы, дзе лілася людская кроў. Нікалай Гастэла вёз у сэрцы матчын наказ:

— На чужой зямлі не садзіся. У жалезную клетку жывым не здавайся. Арол каршуну не брат. Дзяўбі каршуноў да крыві, да смерці іх расклёўвай.

І Нікалаю здавалася, што гэты наказ адгукаецца рэхам у дубровах, звініць у поўнаводных рэках.

І сын быў верным матчынаму наказу. Ён усёй сваёй арлінаю сям'ёй смела налятаў на чорных фашысцкіх каршуноў і ад магутных арліных удараў каршуны падалі дадолу мёртвымі. Авеяны славай герой выходзіў з бітвы пераможцам.

У Айчынную вайну смелы воін уступіў узмужнелым, абстрэленым, уступіў з вялікім баявым вопытам. Ён ведаў звычаі і тактыку ворага і цвёрда ўсвоіў правіла — налятай смела, не давай ворагу разгарнуцца, бі яго метка, бі смяртэльна, інакш сам будзеш бітым.

І Нікалай Гастэла не адступаў ад гэтага правіла. Ён не баяўся адзін урэзацца ў зграю фашысцкіх сцярвятнікаў і смела ўступіць у бой.

Самы гарачы бой быў 3 ліпеня. Нікалай Гастэла са сваёй эскадрыльяй вылецеў бамбіць скопішча варожых войск, іх камунікацыі. Фашысцкія піраты вылецелі насустрач. Завязаўся вялікі паветраны бой. Нікалай Гастэла налятаў смела, біў сцярвятнікаў датуль, пакуль яны, ахопленыя полымем, не падалі ўніз.

З вышыні палёту Нікалай Гастэла бачыў самы жорсткі бой наземных войск. Вораг рваўся на нашу зямлю. Агонь савецкай артылерыі і авіяцыі стрымліваў прасоўванне ворага. Выбухам авіяцыйных бомб Нікалай Гастэла глушыў і рваў на кавалкі чужынцаў, разбіваў нямецкія танкі, аўтамашыны.

Адважны воін выходзіў з бою пераможцам.

Але вось раптам снарад варожай зяніткі трапіў у бензінавы бак. Едкім дымам напоўнілася кабіна. Самалёт запылаў. Што. рабіць? Яшчэ можна выратавацца. Можна спусціцца на парашуце, — падумаў Нікалай і ў сэрцы прачнулася пагарда да смерці, у сэрцы загаварыў матчын наказ. І гэты вялікі наказ адгукнуўся, пакаціўся рэхам у прасторы.

— На чужой зямлі не садзіся.

І Нікалай Гастэла не змяніў запавету. Абгарэлай рукой ён накіраваў свой пылаючы сама-

лёт на самае большае скопішча аўтамашын з боепрыпасамі, на цыстэрны з гаручым. Страшэнны выбух бензінавых цыстэрн скалануў наваколле, чырвоныя слупы ўзмахнулі ў неба.

Так загінуў мужны сын нашага народа, які і смерць сваю абрушыў на галаву ворага, як магутны, сакрушальны ўдар.

## ГЕНЕРАЛ-МАЁР
# ЛЕЎ ДАВАТАР



З самага пачатку Айчыннай вайны Л. М. Даватар камандаваў вялікімі вайсковымі злучэннямі. Пад яго камандай біліся з ворагам тысячы байцоў і камандзіраў. Баец быў для яго чалавекам-воінам. Генерал быў бацькам сваіх байцоў.

У паходах, пераходах, у зацішшы паміж сражэннямі і паміж вырашэннем стратэгічных планаў, хітрых ваенных ходаў, суровы і разумны генерал знаходзіў хвіліну, каб пацешыць вока лясным краявідам і каб падняць галаву і з прыемнасцю прыслухацца да порсткага шчэбету дробных птушак. А праз дзесяць хвілін генерал вёў свае вайсковыя злучэнні ў самае небяспечнае месца на патрэбную баявую аперацыю.

Суровы, добры, жартаўлівы, задумённы — вось некаторыя рысы яго натуры.

Годамі — гэта «малады» генерал. Сваімі ведамі і справамі — гэта спрактыкаваны генерал.

Вышэйшым камандаваннем генерал Даватар быў прысланы камандаваць вялікім кавалерыйскім злучэннем і выканаць баявое заданне — прабіцца ў тыл ворагу і дэзарганізаваць яго на вялікім участку фронта. Пачалася аперацыя. Некалькі дзён вялі разведку. А потым пайшлі ў атаку і прарвалі нямецкі фронт на ўчастку ад У. да П. Масы кавалерыі спешыліся, вялі бой.

Варожыя часці былі разбіты і рассеяны. Часці Даватара рушылі ў тыл. Прайшлі балота, замасцілі дрыгвяную грэблю на балотным пераходзе. Конны рэйд у тыл ворага закончыўся бліскуча.

На ўсіх навакольных дарогах, на ўсёй разлегласці ўстанавілі засады. Пачалася ліквідацыя асобных нямецкіх груп, знішчаліся цэлыя часці, разбураліся варожыя камунікацыі, знішчаліся эшалоны, сеялася паніка ў асяроддзі ворага.

Па нямецкіх часцях пайшла чутка, што ў тылу ў іх дзейнічае стотысячная савецкая конная армія. Даватар загадаў падтрымліваць гэтыя чуткі сярод немцаў. Немцы ўпадалі ў паніку. Многія часці рассейваліся і адступалі, не ўступаючы ў бой. У раёне Р. зняўся са

свайго месца і ўцёк у паніцы штаб 6-й нямецкай арміі.

Генерал Даватар сам знайшоў сабе праваднiка па ўсіх навакольных месцах. Гэта быў калгаснік-канюх Б. Ён быў і разведчыкам, і вызнавальнікам дарог. Хадзіў ён заўсёды з аброццю цераз пляча і гаварыў, што шукае сваіх коней. Так не раз ён выратоўваўся ад немцаў. Гэты просты чалавек многа памог генералу Даватару ў справе арыентыроўкі на мясцовасці і ў справах разведкі. Калі пасля заканчэння аперацыі Даватар выводзіў сваю групу з нямецкага тыла, яго праваднік тав. Б. астаўся там у родных мясцінах. За сваe дзеянні ён узнагароджан ордэнам Чырвонай Звязды. Даведаецца ён пра гэта скора, калі Чырвоная Армія ачысціць ад немцаў яго мясцовасць.

Дзейнічаць у тылу было нялёгка. Часта не было чаго есці. Жывіліся ягадамі і грыбамі. Генерал Даватар паджартоўваў:

— Папасецеся на ягадах. Ягада такая рэч, што з яе нават найлепшы спірт гоняць.

Першага верасня, пасля заканчэння аперацыі, з вялікімі баямі выходзілі з нямецкага тылу. Немцы замініравалі дарогі, парабілі завалы і пасткі. Даватар сам займаўся справамі разведкі, сам бываў на ўсіх участках баёў — гэты рухавы чалавек малога росту, добры бацька і друг для байцоў і суровы, хітры, разумны і здагадлівы іхні генерал.

Выдатны камандзір бліскуча правёў вялікую аперацыю ў тылу ворага і вывеў адтуль сваіх байцоў.

Увосень 1941 года і зімой 1942 года генерал Даватар узначальваў ужо новыя баявыя аперацыі на іншых участках фронта, у вялікіх баях за Радзіму.

Ва Ўказе Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР сказана: «За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства, прысвоіць званне Героя Совецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая Звязда» генерал-маёру Даватару Льву Міхайлавічу».

## ПАРТЫЗАН
# ЦІХОН БУМАЖКОЎ

Калі люты і крывяжэрны вораг напаў на совецкую зямлю, помстай і гневам напоўніліся сэрцы беларусаў. Разам з Чырвонай Арміяй беларускі народ вышаў адстойваць сваю социялістычную Радзіму, сваю чэсць і свабоду.

Ціхая палеская рэчка стала сведкай гераічнай барацьбы партызан з фашысцкімі галаварэзамі. У адзін з летніх дзён да яе берагоў накіравалася калона танкаў і бронемашын. Немцы імкнуліся фарсіраваць рэчку і заняць раённы цэнтр. Але рачулка стала непрыступным рубяжом для фашыстаў.

Перад вачамі гітлераўцаў у паветра ўзляцеў мост. Шквалам меткага агня з кулямётаў і вінтовак сустрэлі партызаны няпрошаных гасцей. Пад гусяніцы танкаў паляцелі гранаты. Пераправа праз рэчку была сарвана. 15 варожых танкаў і гэтулькі-ж бронемашын былі выведзены са строю.

Не адзін раз імкнуўся вораг фарсіраваць рэчку. Але партызаны гераічна яго адбівалі. На чале партызанскага атрада стаяў Ціхон Паўлавіч Бумажкоў.

Рыхтуючыся да барацьбы з фашыстамі, партызаны атрада Ціхона Бумажкова вучыліся майстэрству валодаць зброяй, маскіравацца, карыстацца тапаграфічнай картай, компасам, набывалі неабходныя веды ў сапёрнай справе. Усё гэта добра спатрэбілася потым у жорсткіх схватках з гітлераўцамі. Аб'яднаныя нянавісцю да фашыстаў, яшчэ зусім нядаўна малапрыкметныя простыя савецкія людзі, пад кіраўніцтвам бальшавіка Бумажкова ішлі на гераічныя подвігі, знішчалі ненавісных гітлераўцаў, іх тэхніку, зброю.

— Акупантаў партызаны знішчаюць усюды,—расказвае Ціхон Паўлавіч. —У нас кожная рэчка, яр, лясок — непрыступныя рубяжы барацьбы. Нават мірнае з выгляду поле становіцца пасткай для ворага.

За кароткі час атрад Бумажкова знішчыў 18 фашысцкіх танкаў і бронемашын. У рукі партызан трапілі 50 матацыклаў і вялікія запасы боепрыпасаў. Партызаны здабываюць каштоўныя звесткі для Чырвонай Арміі.

— Як родная маці клапоціцца аб сваіх дзецях, так клапоціцца аб нас усё насельніцтва,— гаворыць Ціхон Бумажкоў.

У партызан вельмі многа памочнікаў, многа сяброў. Праз давераных людзей у вёсках партызаны атрада Героя Совецкага Саюза Ціхона Бумажкова заўсёды ведаюць аб прасоўванні варожых часцей. І таму, там, дзе вораг не чакае партызан, яны вырастаюць быццам з зямлі, закідваюць яго гранатамі, паліваюць шквалам агня з кулямётаў і аўтаматаў.

---

Пятрусь БРОЎКА

## ГЕРОІ-ПАРТЫЗАНЫ

Свой атрад паміж лясоў
Вёў таварыш Бумажкоў.
Гнеў народны запылаў,
Партызаніць іх паслаў.
Сотні храбрых, як адзін,
Кожны з іх адданы сын.
Партызанам баявым
Смерць не страшная зусім,
Бо яны ад чужаніц
Вышлі край свой бараніць.

Вось ідуць яны ў глушы,
Помста пеніцца ў душы.
Раптам чуюць, што гудуць —
Танкі ворага ідуць.
Акружыўшы ў лесе шлях,
Лёг атрад па двух баках.
Гул мацней, бліжэй ішоў...
Вось і банда лютых псоў.
Танкі скрыпаюць, равуць,
Быццам гадзіны паўзуць.
Даў наказ без лішніх слоў
Партызанам Бумажкоў:
— Так змагацца, так знішчаць,
Каб магілу тут ім даць.
І паслаў тады атрад
На падлюг гасцінцаў шмат.
— Ты за нашым хлебам прэш?
На, падлюга, кулю з'еж!
— Ты забраць наш хочаш сад?
Паспытай-жа, гад, гранат!
— Кроў піць хочаш, воўчы сын?
На бутэльку, пі бензін!
Біў атрад сабак удала,
Білі кулі і штыкі.
Восемнаццаць танкаў пала,
Засталіся касцякі.
Неслі ворагі нам здзек,
Леглі ворагі навек.
І павёў паміж лясоў
Зноў атрад свой Бумажкоў.

## КАПІТАН
# ГАУРЫІЛ ПАЛАЎЧЭНЯ

У баях, жорсткіх і цяжкіх, на фронтах айчыннай вайны ён з першых дзён. Гаўрыіла Палаўчэню ведаюць сотні, тысячы байцоў і камандзіраў, ведаюць і паважаюць за яго храбры дух, невычэрпную энергію воіна-беларуса, увабраўшага ў сябе найлепшыя якасці свайго вольналюбівага, гордага народа.

Геройства і адвага — яго дэвіз. Капітан Палаўчэня не толькі бясстрашны, але і ў поўным сэнсе слова — страсны майстар боя. Вось ён, узначальваючы экіпаж танка, урываецца ў вёску Л. Прарывае абарону праціўніка. Кулямётным і гарматным агнём знішчае 200 нямецкіх салдат і афіцэраў. Неўгамонны, прагнучы боя, ён вядзе яго як таленавіты мастак. Гусяніцы яго танка сакрушаюць усё на сваім шляху: 97 павозак з боепрыпасамі і маёмасцю ўтаптана ў зямлю, 2 гарматы навечна змоўклі, 6 мінамётных кропак, тры станковыя кулямёты перасталі служыць ворагу.

І танк зноў ідзе наперад, ідзе на ворага. Бясстрашнасць і майстэрства — крыніца новых подвігаў. Палаўчэня са сваім экіпажам прымушае бегчы без аглядкі два батальёны пяхо-

ты праціўніка. Але вось 15 фашыстаў у гневе і лютай, звярынай злосці кідаюцца на танк, падпальваюць яго. Палаўчэня загадвае механіку, вадзіцелю і башаннаму стралку пачаць інтэнсіўны агонь.

Адзінаборства танка з фашыстамі закончылася перамогай. Ап'янеўшыя ад злосці фрыцы злажылі свае галовы назаўсёды. Экіпаж мужных, што вёў гэты танк, быў выратаваны.

У многіх другіх баях капітан Гаўрыіл Палаўчэня знішчыў не адну групу аўтаматчыкаў, 30 аўтамашын ворага, сотні салдат і афіцэраў.

Слаўны сын беларускага народа, герой-воін удастоены ўсенароднай славы. Гаўрыілу Антонавічу Палаўчэні Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 5 мая г. г. прысвоена званне Героя Совецкага Саюза.

---

## ПАРТЫЗАН
# ФЁДАР ПАЎЛОЎСКІ

Слава аб атрадзе, якім камандуе Герой Савецкага Саюза Фёдар Іларыёнавіч Паўлоўскі, расце з кожным днём. Многа фашысцкіх сабак улажылі ў магілу грозныя партызаны.

Было гэта ў пачатку вайны. У калгас уварвалася нямецкая мотамехпяхота і пачала гвалты і грабежніцтва.

У гэты час непадалёку ў лесе знаходзіўся са сваім атрадам Паўлоўскі. Чуткі аб дзікім разгуле фашыстаў дайшлі да яго. Разведчыкі данеслі, што сіла ворага ў некалькі разоў перавышае сілу партызанскага атрада.

Але Паўлоўскі ведаў сілу гневу, які кіпіць у сэрцах партызан да нямецкіх акупантаў, знаў іх адданасць Радзіме, смеласць і мужнасць у барацьбе. Ён рашыў напасці на бандытаў і жорстка адпомсціць ім.

Ціха шумела даспяваючае жыта. Яшчэ цішэй паўзлі, акружаючы вёску, партызаны. Яны паўзлі ў начным змроку раўчукамі і вузкімі сцяжынкамі. Кожны з іх ведаў сваё месца і абавязак. Трэба было зняць вартавых, каб яны не ўзнялі трывогі, захапіць ворага знянацку.

Паўлоўскі сам першым пайшоў на бой. З групай байцоў ён неўзаметку знікнуў у змроку.

І вось грымнулі выбухі гранат, кінутых рукой партызан. На вуліцу праз вокны і дзверы калгасных хат пачалі ўцякаць фашысты, але з-за вуглоў калгасных будынкаў на іх сыпаліся градам кулі. Страчыў кулямёт.

Храбрыя партызаны тав. Паўлоўскага знішчылі ў тую ноч 150 фашысцкіх грабежнікаў.

У другі раз Паўлоўскі падпільнаваў праходзіўшы на фронт фашысцкі поезд з боепрыпасамі. Партызаны зрабілі на рэйках завал. Паравоз спыніўся. Фашысты, якія суправаджалі поезд, стараліся расчысціць дарогу, але іх змялі аўтаматы партызан Паўлоўскага. У поезд паляцелі гранаты, бутэлькі з гаручым, і праз хвіліну ўвесь састаў быў ахоплены агнём. Доўга пераклікаўся рэхам беларускі бор ад аглушаючых выбухаў.

У вёсцы, прылягаючай да шляху, распалажыўся штаб нямецкай дывізіі. Логава фашыстаў было пад моцнай аховай. Атрад Паўлоўскага, аб'еднаўшыся з другім атрадам, нападае на варожы штаб. У выніку быў знішчан склад штаба. Захоплена 35 аўтамашын, многа матацыклаў і зброі.

Выключны гераізм і смеласць праявіў Паўлоўскі са сваімі баявымі таварышамі ў схватках з танкамі.

Лесам праходзіла нямецкая танкавая калона. Атрад Паўлоўскага разам з суседнім атрадам смела напаў на браніраваных карычневых свіней. У жорсткім баі партызаны бутэлькамі з гаручым знішчылі 18 нямецкіх танкаў.

---

Антон БЯЛЕВІЧ

## СКЛІКАЕ ПАЎЛОЎСКІ ДРУЖЫНУ...

Склікае Паўлоўскі магутную рáць,
Склікае на бітву дружыну:
— Гэй, сябры вы родныя,
Лагер храбры мой!
На вайну народную,
На апошні бой!
На вайну крывавую
Кліча грозны час.
Наша справа правая,
Сіла, воля ў нас.
За палі стаптаныя,
Руйнаванне хат, —
Галавой паганаю
Хай заплаціць кат.
Дык за мной-жа, родныя,
Мужныя, за мной!
На вайну народную!
На апошні бой!

Між сініх ракітаў і жоўтых житоў,
Прыкрыўшыся ноччу імглістай, —
Паўлоўскі атрад свой да вёскі павёў,
Каб выбіць, каб знішчыць фашыстаў.
Закляцаў затворам і бліснуў мячом,
І вышаў уперад Паўлоўскі:
— Шаткуй іх мячамі, калі іх штыком,
Гані іх з радзімае вёскі!

І слаліся трупы, і падалі ніц,
У покат ляжалі ля тыну.
Крышыла, душыла ушчэнт чужаніц
Адвага паўлоўскай дружыны.
Малінавай стужкай займаўся усход,
І ліпы звінелі ліствою.
Збіраўся Паўлоўскі у новы паход,
Ён клікаў атрад свой да бою.

## СНАЙПЕР
# ФЁДАР СМАЛЯЧКОЎ



Карыя вочы, разумныя і дзёрзкія. Мілы з усмешкай твар. Ён быў старанным калгасным пастухом у Беларусі. Ён быў стаханаўцам на будоўлях Ленінграда.

Калі пачалася вайна, Фёдар Смалячкоў, юнак з Магілёўшчыны, вучыўся ў Ленінградскім фабрычна-заводскім вучылішчы. У гэты суровы час ён пакінуў вучобу і прышоў у ваенкамат.

Смалячкова ўзялі ў дзеючую армію. Ён быў поварам. Але бунтарнае сэрца юнака-змагара кіпела нянавісцю да ворага.

— Поварам,— сказаў ён камандзіру часці,— можа стаць усякі. А я малады, я хачу ісці ў бой.

Фёдару Смалячкову далі вінтоўку. Ён пайшоў у разведку. Ён не ведаў страху. Ён дастаўляў у штаб самыя важныя звесткі. Потым Смалячкоў навучыўся метка страляць і залёг у снайперскі сакрэт. Дзень за днём ён сачыў двуногіх фашысцкіх звяроў і знішчаў іх, як шалёных сабак. За галаву героя нямецкія афіцэры абяцалі сваім салдатам высокія ўзнагароды. На аднаго Смалячкова пасылалі групы ў 10—20 немцаў. Аднойчы на снайпера Смалячкова пайшлі ў атаку два нямецкіх узводы. Смалячкоў храбра ўступіў у бой, закідаў фашыстаў гранатамі і вышаў з бою пераможцам.

19-ці гадовы снайпер знішчыў сто дваццаць пяць фашыстаў. Ваенны Совет фронта ўзнагародзіў Смалячкова ордэнам Леніна. Совецкі ўрад прысвоіў яму званне Героя Совецкага Саюза.

## ПАРТЫЗАН
# МІХАІЛ СІЛЬНІЦКІ

Гэта быў вялікі бой, у якім партызаны праявілі сапраўдную баявую вытрымку і гераізм. На ўзбраенні партызан былі вінтоўкі, аўтаматы і кулямёты, здабытыя ў многіх баях з ворагам. Смелых беларускіх партызан натхняла і вяла на смяротны бой гарачая любоў да сваёй, зняслаўленай ворагамі, беларускай зямлі, узнімала кіпучая нянавісць да гітлераўскіх галаварэзаў.

Ініцыятыва была, як і заўсёды, у руках нападаўшых партызан. Перад намі ва ўсёй велічнасці ўстае гераічны, благародны вобраз маладога беларускага партызана, калгасніка і комсамольца, кулямётчыка атрада Мішы Сільніцкага, які авеяў сябе неўміручай славай.

Міша ведаў, што перад ім моцны і каварны вораг. Адной засады, адкуль партызаны будуць біць па нямецкай калоне з тыла і фланга,—мала. Трэба яшчэ добра ўдарыць фашыстаў у лоб. Сільніцкі са згоды камандавання ўстроіў кулямёт пад застрэшшам адной з крайніх хат вёскі К. Бой разгараўся. Поле наўкол ужо было ўсеяна дзесяткамі трупаў нямецкіх салдат.

Надышоў час застрачыць кулямёту. 30 нямецкіх салдат уступалі ў вёску. Кулямётчык Міша чакаў. Калі немцы прыблізіліся на 20 метраў—Сільніцкі адкрыў агонь. Ні адзін бандыт не астаўся жывым. Усе яны пляглі на ўскраіне вёскі, на той самай зямлі, якую фашысты лічылі пакаронай.

Бой канчаўся. Сільніцкі сваім кулямётам прыкрываў адыход атрада. Раз'юшаныя няўдачай фашысты яшчэ цясней акружылі Сільніцкага. З усіх бакоў страчылі нямецкія аўтаматы.

— Жывым не дамся ў рукі гадам, — шаптаў Міша. І ў тую-ж мінуту адчуў рэзкі ўдар. Ранены, абліваючыся крывёю, падняўся Міша Сільніцкі ва ўвесь рост і з нажом-фінкай у руках пайшоў на насядаўшых ворагаў. Яшчэ два разбойнікі ўпалі мёртвымі і трэці фашыст быў ранен.

Міша загінуў у гэтым баі смерцю храбрых але ён перамог сваіх лютых ворагаў і дорага аддаў сваё жыццё.

За адвагу і геройства, праяўленыя ў партызанскай барацьбе ў тылу ворага супроць нямецкіх захопнікаў, Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза ССР прысвоіў Міхаілу Сільніцкаму званне Героя Совецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая Звязда».

# ЛЕЙТЭНАНТ
# ІВАН КАЎШАРАЎ

Сілы ворага на гэтым участку фронта былі значна большыя. І здавалася, жменька храбрацоў не стрымае лютага націску браніраваных фашысцкіх страшыдлаў, якія клінам сунуліся наперад. У мужных совецкіх байцоў на зыходзе былі боепрыпасы. Але ў гэты напружаны час пачуўся ў небе роўны рокат матораў. Байцы ўбачылі ў небе сталінскіх сокалаў.

Іх вёў верны сын беларускага народа, лейтэнант Іван Каўшараў. Эскадрылья пікіруючых бамбардыроўшчыкаў ішла на бронетанкавую калону, на шэрыя рады нямецкай пяхоты.

Засвісталі бомбы, здрыганулася ад выбухаў зямля, паляцелі ўгару абломкі машын, запылалі танкі. Наступленне ворага захлябнулася, шэрыя рады салдат замітусіліся, павярнулі назад. Поле бою было ўслана трупамі нямецкіх салдат і афіцэраў, абгарэлымі танкамі, матацыкламі, гарматамі...

Аднойчы эскадрылья Івана Каўшарава атрымала баявую задачу — разбамбіць пункт, дзе запраўляюцца гаручым варожыя аўтамашыны і танкі. Бамбардыроўшчыкі ляглі на баявы

курс. Вось яны прарваліся праз вогненнае кальцо варожых зянітак. Паляцелі бомбы. Шуганулі вогненныя слупы. Заданне выканана. Знішчана 5 цыстэрн з гаручым, 20 аўтамашын і 8 танкаў.

Больш сотні баявых вылетаў зрабіў Іван Каўшараў за дні Айчыннай вайны. Сілу яго магутных удараў адчулі чужынцы на сваіх галовах.

Высока ацаніў Совецкі Урад баявыя заслугі сына беларускага народа Івана Каўшарава, прысвоіўшы яму званне Героя Совецкага Саюза.

## КАПІТАН
## АЛЯКСЕЙ АНТОНЕНКА



Аляксей нарадзіўся ў 1911 годзе на Беларусі ў вёсцы Васьковічах, што на Віцебшчыне. Бацька яго Касьян быў пуцявым рабочым на чыгунцы. Зусім рана Аляксей астаўся без бацькі і мацеры, і цяжка было прадугледзець, што магло-б чакаць у жыцці маленькага хлопчыка ў цяжкія годы, грозныя годы грамадзянскай вайны, калі-б маладая совецкая рэспубліка не атуліла яго мацерынскімі клопатамі.

Цяпер Аляксей з цёплай удзячнасцю ўспамінае сваё жыццё і вучобу ў школе пры дзіцячым доме, а затым навучанне ў ФЗУ.

Аляксей Антоненка пятнаццаці год пачаў працаваць на станцыі Дно слёсарам у дэпо, а потым памочнікам машыніста на паравозе.

Праз год ён — актыўны комсамолец, добры рабочы. Гарачы, малады патрыёт просіць камітэт комсамола паслаць яго ў авіяцыйную школу.

1932 год знамянальны ў жыцці Аляксея Антоненка. Ён выдатна заканчвае авіяцыйную школу. Маладога марскога лётчыка, які выдатна асвоіў тэхніку пілатыравання, прызначаюць інструктарам-лётчыкам. У гэты час ён уступае ў рады ВКП(б).

За шэсць год работы інструктарам Антоненка падрыхтаваў звыш ста ваенных марскіх лётчыкаў. З 1938 года Аляксей на Чырвонасцяжнай Балтыцы. Ён лётчык-знішчальнік з вялікаю славай. Можна многае расказаць аб гераічных баях за Радзіму, у якіх прымаў удзел за апошнія годы т. Антоненка. Ужо ў трох войнах мужны лётчык бясстрашна змагаўся з ворагам. За баявыя заслугі ён двойчы ўзнагароджаны Урадам СССР.

З першых дзён Айчыннай вайны Аляксей у баях. Ён жорстка помсціць нямецкім акупантам за сваю родную заняволеную Беларусь. Аляксею Кас'янавічу Антоненка прысвоена высокае званне Героя Совецкага Саюза за мужнасць і геройства, праяўленыя ў баях з фашызмам.

## ЛЁТЧЫК-ЗНІШЧАЛЬНІК
# ВІКТАР ТАЛАЛІХІН



Таран—самы смелы і рашучы від паветранага бою—вельмі папулярны сярод савецкіх лётчыкаў. Уступіўшы з ворагам у бой, сталінскія сокалы ніколі не выпускаюць яго жывым. Здараецца, што канчаюцца баявыя сродкі, няма больш гаручага, не астаецца нічога, акрамя чалавека і машыны, і ўсё-ж вораг не павінен уратавацца. Яго неабходна знішчыць, хаця-б цаною ўласнага жыцця.

Уночы на 17 жніўня, калі фашысцкія бамбардыроўшчыкі рваліся да Масквы, малодшы лейтэнант Віктар Талаліхін па загаду камандавання ўзняўся ў паветра на сваім знішчальніку.

Зайшоўшы з боку месячнага святла, ён стаў

шукаць самалётаў праціўніка і на вышыні 4.800 метраў заўважыў «Хейнкель-111». Ён накіроўваўся да Масквы. Віктар Талаліхін зайшоў ворагу ў хвост і атакаваў яго. Смелы лётчык падбіў правы матор бамбардыроўшчыка. Вораг рэзка змяніў курс і, знізіўшыся, хацеў павярнуць назад. Талаліхін 6 раз паўтарыў свае атакі. Яго ястрабок аставаўся недасягальным для ворага.

Разам з праціўнікам Віктар знізіўся да вышыні ў 2.500 метраў. Але тут вышлі ўсе боепрыпасы. Можна было гнаць ворага і далей. Ды што з таго? На адным маторы ён мог ляцець яшчэ вельмі доўга і ўсёроўна ўцёк-бы. Аставалася — тараніць. «Калі і загіну, дык адзін, а фашыстаў у бамбардыроўшчыку чацвера»,—падумаў Талаліхін.

Мужны сокал рашыў вінтом адсекчы хвост праціўніку. Вось іх раздзяляюць толькі некалькі метраў. Маладому совецкаму лётчыку ўжо добра відаць браніраванае чэрава варожага самалёта. У гэты час вораг пусціў чаргу з буйнакаліберннага кулямёта. Варожая куля апаліла правую руку Талаліхіна. І тут совецкі пілот даў поўны газ і ўжо не вінтом, а ўсёй сваёй машынай пратараніў праціўніка. Раздаўся страшэнны выбух. Варожы самалёт грымнуўся на зямлю.

Гэта быў першы геоічны подвіг маладога совецкага лётчыка. Потым ён пратараніў яшчэ некалькі варожых самалётаў. Яго прыкладу

сталі следваць дзесяткі і сотні совецкіх пілотаў.

Імя храбрага сталінскага сокала, вернага сына беларускага народа Віктара Талаліхіна стала вядома ўсяму совецкаму народу, які па-праву ганарыцца яго геройствам і мужнасцю.

Совецкі ўрад адзначыў баявыя заслугі Віктара Талаліхіна вышэйшай узнагародай. Мужнаму лётчыку прысвоена званне Героя Совецка